# Удзельнікам XI Міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер-2009 у Магілёве»

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з адкрыццём незабыўнага свята мастацтва і дружбы — XI Міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер-2009 у Магілёве».

На працягу ўсёй сваёй гісторыі фестываль з гонарам выконвае высакародную місію захоўвання пераемнасці пакаленняў і прымнажэння лепшых традыцый айчыннай і сусветнай эстрады. На яго сцэнічных пляцоўках збіраюцца самыя папулярныя артысты розных краін і музычных эпох, гучаць бессмяротныя мелодыі і рытмы, якія складаюць бясцэнны залаты запас сучаснай культуры. Прыемна адзначыць, што сёлета гэты творчы форум набыў новы твар і ўпрыгожыў сваю праграму яркімі мерапрыемствамі многіх відаў і жанраў мастацтва, разлічанымі на дарослых і юных гледачоў. Не сумняваюся, што ён стане цудоўным падарункам для жыхароў і гасцей Магілёўшчыны, паслужыць узбагачэнню духоўнага жыцця нашай цудоўнай зямлі, умацаванню дружбы і згоды паміж народамі. Жадаю вам невычэрпнага натхнення, творчых дасягненняў, удачы ва ўсіх справах і пачынаннях, здароўя, шчасця і выдатнага настрою.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## Аляксандр Лукашэнка: «Эканоміка Кітая здольна быць лакаматывам працэсу рэфармавання сусветнай фінансавай сістэмы»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтао з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння КНР.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ва ўмовах глабальнага фінансавага і эканамічнага крызісу кітайская эканоміка на практыцы прадэманстравала сваю ўстойлівасць да негатыўнага ўздзеяння знешніх фактараў і здольнасць быць лакаматывам працэсу рэфармавання сусветнай фінансавай сістэмы.

Развіццё беларуска-кітайскага стратэгічнага супрацоўніцтва з'яўляецца прыярытэтам беларускай знешняй палітыкі, падкрэсліў Прэзідэнт. «Мы нацэлены і ў далейшым умацоўваць наша ўзаемадзеянне па актуальных пытаннях сусветнага развіцця і аказваць падтрымку адзін аднаму ў міжнародных арганізацыях, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Упэўнены, што значныя крокі па развіцці двухбаковага крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва, зробленыя апошнім часам, забяспечаць далейшае павышэнне эфектыўнасці беларуска-кітайскіх гандлёва-эканамічных сувязяў».

## Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні Прэзідэнту Інданэзіі ў сувязі з ахвярамі землетрасення на Суматры

У сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі, выклiканымі разбуральным землятрусам на інданэзійскім востраве Суматра, кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Інданэзіі Сусіла Бамбангу Юдхаёна, родным і блізкім загінулых.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Працоўныя мігранты з краін СНД не з'яўляюцца небяспечнымі для Беларусі і Расіі

**Учора прайшло чарговае пасяджэнне Савета кіраўнікоў міграцыйных органаў дзяржаў — удзельніц СНД. Асаблівая ўвага была нададзена тэме працоўнай міграцыі.**

— Сусветны фінансавы крызіс паўздзейнічаў на міграцыйныя працэсы, — паведаміў **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей БЯГУН.** — Колькасць беларусаў, якія выязджаюць на працу за мяжу, сёлета зменшылася ў тры разы. Разам з тым, сёння ў Беларусі на 70 % павялічылася колькасць замежнай працоўнай сілы. Гэта тэндэнцыя, мяркую, захаваецца да канца года. За 9 месяцаў у нашай краіне працаўладкавана 2 тысячы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. У асноўным гэта высокакваліфікаваныя спецыялісты ў сферы будаўніцтва, спорту, навукі. Праўда, летам быў усплёск нелегальнага найму замежных рабочых на будаўнічыя аб'екты ў Беларусі. Цяпер сітуацыя знаходзіцца пад кантролем.

Паводле слоў **дырэктара Федэральнай міграцыйнай службы Расіі Канстанціна РАМАДАНОЎСКАГА,** працоўныя мігранты з краін СНД, нягледзячы на крызіс, запатрабаваныя і ў Расіі.

— Больш за тое, працэсу працоўнай міграцыі сёння мы надалі больш арганізаваную форму — стала больш замежнікаў, якія працуюць легальна, — адзначыў Канстанцін Рамаданоўскі. — Што датычыцца грамадзян Беларусі, то ў нас маецца адзіная міграцыйная картка. У Расіі цяпер рыхтуецца законапраект для стварэння больш камфортных умоў для працоўных мігрантаў. Мы зацікаўленыя, каб замежнікі атрымлівалі працу на прыбытковых прадпрыемствах, выбіралі працу па асабістым жаданні.

Прадстаўнікі Беларусі і Расіі пераканалі, што працоўныя мігранты не з'яўляюцца крымінальна небяспечнымі.

— Больш за 90 % злачынстваў на тэрыторыі нашай краіны ўчыняюць самі расіяне, — удакладніў Канстанцін Рамаданоўскі. — Удзельная ж вага злачынстваў па віне мігрантаў складае толькі 3,6 %. Скажу нават так, у Расіі няпоўнагадовыя больш небяспечныя, чым працоўныя мігранты.

У Беларусі ж працэнт злачынстваў, якія ўчыняюць працоўныя мігранты, меншы за 1 %.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Айчынныя прадпрыемствы: ЦЭНЫ АД ВЫТВОРЦЫ І ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Наяўны разлік у нас выключаецца, яго можна будзе зрабіць толькі праз аддзяленне «Беларусбанка», што месціцца літаральна побач. Касавы апарат мы набылі, але пакуль не хочам яго ўстанаўліваць, паколькі ўзнікае праблема інкасацыі наяўных грошай. Прадаваць прадукцыю будзем дробным і буйным оптам. Дробны — гэта адна каробка, 12 пар абутку адной мадэлі. Буйны — ад 300 пар, там ужо прапануем асаблівыя ўмовы для пакупніка, — расказаў Віктар Макоўчык.

Мы пацікавіліся, а як быць фізічным асобам, калі ў каго ўзнікне жаданне наведаць выставу-кірмаш і прыдбаць які абутак дробным оптам?

— Сяброўства і ўзаемадапамога — лепшы спосаб выйсця з крызісу, — усміхнуўся суразмоўца. — Грамадзяне ж могуць скааперавацца, тым больш што грашовыя сродкі ад фізічных асобаў за тавар таксама могуць быць пералічаны на наш разліковы рахунак — гэта звычайная практыка.

— Вокны ўсёй Еўропы да крызісу былі «апранутыя» ў гардзіны і шторы магілёўскай «Стужкі», — у словах **прадаўца крамы-склада ад гэтага прадпрыемства Алы ЛУФІРАВАЙ** красамоўна адчуваецца гонар за прадукцыю прадпрыемства. — Прыгажэй за нашу прадукцыю ў свеце няма!

Поліэфірнае палатно апрацоўваецца спецыяльным саставам (гэта, дарэчы, ноу-хау прадпрыемства, заначыла суразмоўніца, больш у Беларусі яго ніхто не выкарыстоўвае), які «адштурхоўвае пыл, бруд. Гаспадыні дастаткова спаласнуць выраб у нейтральным мыйным сродку і ён зноў будзе як новы. Цяпер на прадпрыемстве выпрацоўваюць гардзіны не толькі традыцыйнага белага, але і іншых колераў. Яшчэ нам падалася цікавай навінка, разлічаная для дзіцячых пакояў: з выявамі лічбаў, падручнікаў, а таксама прыгожых матылькоў. Кошт — 4—6 тысяч за пагонны метр палатна, што, пагадзіцеся, не дорага. «Тым больш што турэцкая арганза ўжо многім надакучыла, да нас апошнім часам пачалі звяртацца нават прафесійныя швачкі, што шыюць гардзіны і шторы для заможных катэджаў». Тым больш зразумелае шкадаванне Алы Луфіравай, што пакуль патэнцыяльныя пакупнікі не надта валодаюць інфармацыяй пра знаходжанне на выставе-кірмашы крамы-склада ад «Стужкі».

— Пакуль мы хутчэй вывучаем попыт па замовах. Працаваць напачатку думаем оптам — па безнаяўным разліку. Магчыма, з цягам часу з'явіцца і касавы апарат. Ужо зараз мы можам прапанаваць не толькі палатно, але і гатовыя вырабы — камплекты штораў для вокнаў гарадскіх і вясковых дамоў, камплекты абрусаў і сурвэтак, — дэманстравала нам узоры прадавец.

...Напрыканцы хацелася б выказаць некаторыя асабістыя заўвагі, што з'явіліся па выніках наведвання выставы-кірмашу айчынных тавараў двойчы. Першапачаткова яна пазіцыянавалася ў тым ліку як і пляцоўка, дзе будзе весціся рознічны гандаль. Як паказалі нашы стасункі з прадстаўнікамі прадпрыемстваў, пакуль не ўсе яны гатовыя весці такі гандаль. Асноўная праблема — інкасацыя наяўных сродкаў, што патрабуе дадатковых намаганняў. Магчыма, надалей гэта і будзе вырашана, але інфармацыя пра магчымасць рознічнага гандлю ўжо пайшла «ў народ» і ёй могуць зацікавіцца не толькі прадпрымальнікі. Выходзіць, грамадзяне рызыкуюць проста змарнаваць свой час? (Зразумела, што зацікаўлены прадпрымальнік, хутчэй за ўсё, будзе дабірацца сюды на ўласным аўтатранспарце). Варта звярнуць увагу і на транспартныя зносіны з рынкам. Сёння туды ходзіць аўтобус, але па раскладзе — праз 1,5—2 гадзіны, што не вельмі зручна, асабліва калі браць пад увагу згаданы вышэй рознічны гандаль. Ды і самім прадаўцам, як многія прызнаваліся, гэта дадае клопатаў. Дарэчы, ці не таму ў тым ліку так марудна вырашаецца пытанне з камплектаваннем працоўных калектываў гандлёвых боксаў? Паводле слоў аднаго з загадчыкаў, транспартнікам пададзена прапанова аб арганізацыі руху аўтобусаў на рынак праз кожныя 15 хвілін. Падаецца, вельмі слушная заўвага. І апошняе. Як мы зазначалі раней, добра было б на тэрыторыі ўсталяваць якія-небудзь паказальнікі — дзе ўласна месціцца выстава-кірмаш айчынных тавараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



**Прадавец Ала ЛУФІРАВА лічыць, што лепш за шторы і гардзіны ад магілёўскай стужкі нічога быць не можа.**

## На слыху
# Грашовыя справы па-беларуску

Па ініцыятыве Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны «Пріорбанк» «вучыць» свае банкаматы стасавацца з кліентамі па-беларуску. Праз пэўны час у банкаматах і тэрміналах банка можна будзе карыстацца не толькі рускай і англійскай, але таксама беларускай мовай. Як кажуць, дробязь — а прыемна.

— А што, хіба гэта такая сенсацыя? — крыху здзівіліся майму званку ў «Пріорбанку». Але больш падрабязна пра ініцыятыву ўсё ж распавялі. Паводле слоў менеджара аддзела грамадскіх сувязяў Святланы Сушкевіч, цяпер ужо заказана і распрацоўваецца праграмнае забеспячэнне на беларускай мове. Дзейнічаць яно пачне, як чакаецца, у першай палове наступнага года, а пры спрыяльным раскладзе — і ў першым квартале. Што да іншых кірункаў беларусізацыі — напрыклад, стварэння беларускамоўнай версіі сайта — то ў «Пріорбанку» такой ідэі пакуль не разглядаюць. Але і не выключаюць.

А мо сапраўды беларускамоўны банкінг — гэта сенсацыя? Нават невялікая праверка, праведзеная карэспандэнтам «Звязды», паказала: на жаль, хутчэй так. Беларускае меню ў банкаматах і беларускамоўная версія сайта ёсць толькі ў «Беларусбанка», ды й то ў банкаматах кліент можа выбраць «беларускі язык», а не мову, а на сайце інструкцыя па рабоце з банкаматамі і інфакіёскамі — толькі рускамоўная. Затое сайт даступны ажно на чатырох мовах, у тым ліку рускай, англійскай і польскай. Ёсць магчымасць выбару беларускай мовы і ў банкаматах «БПС-Банка» і «Белаграпрамбанка», але з сайтамі давядзецца знаёміцца толькі на рускай або англійскай. Аднак у абсалютнай большасці банкаў, якія дзейнічаюць у нашай краіне, беларускай версіі банкаматаў і тэрміналаў усё ж не прадугледжана, не кажучы ўжо пра сайты, інтэрнэт-банкінг і г.д.. Няма беларускай мовы нават на сайце Нацбанка!

Сітуацыя зменіцца?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Абзац

◢ У Мазыры завяршылася выязное пасяджэнне Гомельскага абласнога суда, у якім слухалася крымінальная справа па абвінавачванні двух жыхароў Жлобіна — бацькі і сына — у забойстве вадзіцеля-дальнабойшчыка і нападзе на вясковую краму. Суд прызнаў іх вінаватымі і асудзіў бацьку да 20 гадоў, а сына — да 16 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. У лютым яны забілі 25-гадовага вадзіцеля з г. Крычава, цела якога было знойдзена ў аўтамабілі на тэрыторыі Ельскага раёна. Як высветлілася падчас следства, бацька, 1964 г.н., былы ваенны, захапіўся гульнявымі аўтаматамі. Каб вырашыць фінансавыя праблемы, ён уцягнуў сына ў злачынную дзейнасць. Удваіх яны спачатку напалі на краму ў Светлагорскім раёне, дзе пабілі жанчын-прадаўцоў і прысвоілі выручку, а затым забілі вадзіцеля.

## Поўны абзац

◢ **Сярод англічан, якія кураць, выяўлены небывалы рост папулярнасці самакрутак. Цяпер іх выбіраюць больш за чвэрць дарослых курцоў краіны. Асабліва заўважная гэтая тэндэнцыя сярод жанчын. У 1990 годзе толькі адна з 50 англічанак, якія кураць, аддавала перавагу самакруткам перад іншымі відамі тытунёвай прадукцыі. Зараз гэты паказчык складае 1 з 5. Калі раней, як правіла, самакруткі палілі прадстаўнікі малазабяспечаных слаёў насельніцтва, то цяпер на іх пераходзіць усё больш грамадзян сярэдняга дастатку. У якасці прычын гэтай з'явы называюць эканамічныя (тытунь для самакрутак намнога таннейшы за іншыя віды прадукцыі, паколькі падаткі на яго значна ніжэйшыя) і культурныя (паленне самакрутак чамусьці пачало лічыцца больш стыльным).**

◢ Міліцыянеры горада Ліпецка затрымалі свайго калегу, які скраў катлету ў кліента кавярні. Як паведамілі тамтэйшыя СМІ, цяпер міліцэйскае начальства звольніла малодшага сяржанта патрульна-паставой службы Аляксея Іваннікава, які праштрафіўся. Аднак распачынаць крымінальную справу з-за такога дробнага і кур'ёзнага крадзяжу вартавыя парадку не сталі. Паведамляецца, што міліцыянер зазірнуў у закусачную, замовіў 100 грамаў гарэлкі, а на закусь у яго не хапіла грошай. Выпіўшы, патрульны заўважыў катлету, што «без справы» ляжала на талерцы суседа, хуценька з'еў яе і збег. Гаспадар катлеты, ачомаўшыся ад ступару, пабег за рабаўнікам. Міліцыянера злавілі і перадалі ў рукі калег.

◢ **У Турцыі фургон з пчалінымі вуллямі ўрэзаўся ў прыпаркаваны на ўзбочыне грузавік, у выніку чаго пчолы, якія вырваліся на волю, пакусалі пяцярых пацярпелых у аварыі, а таксама ўсіх паліцэйскіх і медыкаў, якія прыбылі на месца здарэння. Адзін чалавек у выніку ДТЗ загінуў, аднак не паведамляецца, што менавіта стала прычынай яго смерці — атрыманыя пры аварыі траўмы або ўкусы насякомых. Агульная колькасць пацярпелых ад укусаў перавышае 20 чалавек, усе яны шпіталізаваныя. Для таго, каб разагнаць пчолаў і вывесці з месца аварыі ўсіх пацярпелых, спатрэбілася больш за гадзіну. НЗ адбылося непадалёк ад курортнага горада Мармарыс.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## З першых вуснаў

Аляксандр ЛАШЫН:

# «ТРЭБА ПАДНЯЦЬ КОШТ АКЦЫЗУ НА СПІРТ»

**Нягледзячы на тое, што колькасць злачынстваў, учыненых сёлета нападпітку, знізілася больш як на 10 %, Генеральную пракуратуру Беларусі працягвае хваляваць праблема п'янства і алкагалізму. І нядзіўна, бо з-за п'янства сёння распадаецца кожны другі шлюб. Яно ж стала прычынай жорсткіх забойстваў 339 чалавек. Па віне п'яных кіроўцаў на дарогах рэспублікі сёлета загінула 130 чалавек і 689 параненыя. Ахвярамі пажараў сталі 479 нецвярозых. Ад хваробаў, звязаных з атручваннем алкаголем, у краіне памерла 1448 чалавек, з іх 1100 у працаздольным узросце. Якім чынам можна адолець «зялёнага змея»? Пра гэта разважае <u>намеснік Генеральнага пракурора Беларусі Аляксандр ЛАШЫН.</u>**

**ПЕРШЫ ШЛЯХ — СКАРАЦІЦЬ ВЫПУСК «ЧАРНІЛА»**

— Дзяржаўнай праграмай нацыянальных дзеянняў па папярэджанні п'янства і алкагалізму прадугледжана штогадовае скарачэнне на 10 % аб'ёму выпуску пладовых мацаваных ардынарных вінаў. Але, нягледзячы на патрабаванні, шэраг прадпрыемстваў, у прыватнасці ў Клецку і Пружанах, усё адно працягвалі павялічваць выпуск таннай пладовай прадукцыі. Дзякуючы рабоце нашых пракурораў, сёлета за паўгода ўдалося дабіцца скарачэння выпуску віна нізкай якасці ажно на 12, 6 % у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Некаторыя прадпрыемствы ў якасці альтэрнатывы пачалі вырабляць безалкагольную прадукцыю, як правіла, сокі. Частка з іх перайшла на выпуск натуральных вінаў больш высокай якасці.

**ДРУГІ — ПАВЫСІЦЬ КОШТ АКЦЫЗУ НА СПІРТ**

— Даступнасць алкаголю і яго нізкі кошт садзейнічаюць росту ўжывання алкагольных напояў беларусамі, — пракаментаваў ініцыятыву Мінгарвыканкама перавесці асобныя гандлёвыя пункты на кругласутачны рэжым працы Аляксандр Лашын. — Я лічу, што ў першую чаргу неабходна выключыць даступнасць алкагольных напояў і памяняць цэнасную палітыку ў гэтай сферы. Праўда, павышэнне кошту на алкаголь непазбежна выкліча павелічэнне нелегальнага самагонаварэння і завоз водкасцяў, якія ўтрымліваюць спірт, з-за мяжы. Таму, мяркую, неабходна павысіць кошт акцызу на спірт, тады вытворчасць слабаалкагольных напояў стане для прадпрыемстваў нявыгаднай. Прычым гэта новаўвядзенне не выкліча павышэння кошту на напоі дастаткова высокай якасці.

**ТРЭЦІ — ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОЛЬКАСЦЬ РЭАБІЛІТАЦЫЙНЫХ ЦЭНТРАЎ ДЛЯ БЫЛЫХ АСУДЖАНЫХ**

— З п'янствам і алкагалізмам цесна звязана праблема рэцыдыўнай злачыннасці — кожнае другое паўторнае злачынства ўчыняецца ў стане алкагольнага ап'янення. За 8 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам рэцыдыўная злачыннасць у Беларусі вырасла на 8,5 %. Мы мяркуем, што стварэнне рэабілітацыйных цэнтраў, прызначаных дапамагаць былым асуджаным у сацыяльнай адаптацыі, дазволіць знізіць рэцыдыў у краіне. Пра неабходнасць стварэння такіх цэнтраў гаварылася ў лісце Генеральнага пракурора Беларусі, адрасаваным прэм'ер-міністру краіны, у ліпені 2008 года. Зрабіць захады па стварэнні рэабілітацыйных цэнтраў было даручана старшыням аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і МУС. Аднак дадаткова за гэты перыяд не з'явілася ні аднаго цэнтра. У рэспубліцы працягваюць дапамагаць асобам, якія вярнуліся з турмы, толькі раней створаныя 4 рэабілітацыйныя цэнтры.

**ЧАЦВЁРТЫ — УЗМАЦНІЦЬ ВЫКАНАННЕ НОРМАЎ ЗАКАНАДАЎСТВА**

— Мясцовыя органы ўлады недастаткова актыўна праводзяць прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджанне п'янства і алкагалізму, а таксама рэцыдыўнай злачыннасці. Падчас праверак, якія Генеральная пракуратура правяла ў 15 раёнах чатырох абласцей рэспублікі, высветлілася, што шэраг работнікаў мясцовых органаў улады ў поўнай меры нават не ведаюць сваіх абавязкаў. Большасць праграм прафілактычных мерапрыемстваў у рэгіёнах распрацаваныя без уліку рэальнага становішча спраў, а іх выкананне ніхто не кантралюе. Так, сёлета было забраніравана больш за 2 тысячы працоўных месцаў для асобаў, якія вярнуліся на волю. Аднак працаўладкаваныя толькі 774 чалавекі. Гэта можна патлумачыць як адсутнасцю ў вызваленых жадання працаваць, так і фармалізмам мясцовых органаў у іх працаўладкаванні.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Пад'ёмны кран упаў на сталічнай кальцавой

**Пад'ёмны кран упаў з грузавой платформы, на якой яго перавозілі, на МКАД каля аўтобуснага прыпынку Ландэра.**

Аварыя адбылася ўчора раніцай. Вадзіцель грузавога перавозчыка вёз пад'ёмны кран з Латвіі ў Пухавіцкі раён. Падчас руху кран зляцеў з платформы на бардзюр. З-за рэзкага тармажэння перавозчыка ззаду адбыліся дзве аварыі. На шчасце, абышлося без ахвяраў і раненняў.

— Я рухаўся з хуткасцю каля 60 км. Перада мной затармазіла легкавушка, я таксама націснуў на тормаз. І кран упаў. Чаму ён упаў, я не ведаю. Не я ж яго замацоўваў, — расказвае вадзіцель перавозчыка, ураджэнец латвійскага Ліепаі.

Па словах інспектара ДПС УДАІ Кастрычніцкага раёна старшага лейтэнанта міліцыі Ігара Сквarады, магчымыя прычыны ДТЗ — дрэннае замацаванне крана і малая для такога грузу платформа. У абставінах яшчэ будуць разбірацца спецыялісты. Вадзіцелю, па папярэдніх звестках, «свеціць» штраф альбо пазбаўленне вадзіцельскага пасведчання.

Па словах інспектараў ДАІ, аварыі з удзелам перавозчыкаў — не такія частыя на сталічных дарогах.

**Настасся ЗАНЬКО.**

# ВОСЕНЬ-ЗІМА-2009/2010: ФУТРА, ПЕР'Е І ЯРКІ МАКІЯЖ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**СПАРТЫЎНЫЯ РЭКОРДЫ**

Спартыўнае адзенне прыйшло з вуліц на подыумы, і, здаецца, застанецца там надоўга. Для стварэння вобразу «гламурны шык» дадаём абцасы, хоць больш бяспечнымі будуць усё ж красоўкі.

**МОДНЫ СІЛУЭТ**

Модны сілуэт 2010 года: гіпертрафіраваны пясочны гадзіннік — гэта шырокая лінія плячэй і сцёгнаў, тонкая талія, а таксама сілуэт-кокан, грушападобны сілуэт і сілуэт-трапецыя. Актуальны сілуэт «прамая лінія», прычым чым даўжэй і таней, тым лепш, напрыклад, сукенка-максі ў стылі ампір, а таксама чорнае паліто да шчыкалатак.

**МОДНЫЯ ДЭТАЛІ**

У гэтым сезоне будзе шмат футра. Футрам апрацоўваюцца крысы паліто, на паліто павінен быць футравы каўнер, яшчэ лепш — футравыя муфты і нарукаўнікі, а таксама футравыя спадніцы і боцікі.

Аксаміт, атлас і вельвет на піку папулярнасці, з гэтых тканін можа быць адзенне, абутак і аксесуары.

Пальчаткі — таксама модны аксесуар сезона. Выбіраем іх на свой густ — доўгія ці кароткія, замшавыя ці атласныя.

**Падрыхтавала Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**ПЯЦЬ МОДНЫХ РЭЧАЎ ВОСЕНЬСКАГА СЕЗОНА**



**ВЫСОКІЯ БОТЫ-БАТФОРТЫ**

Высокія боты — самая гарачая тэндэнцыя новага сезона. Насіце іх з міні-спадніцамі, міні-сукенкамі, шортамі ці пад легінсы ці вузкія штаны з тунікамі. На працу выбірайце невысокі абцас, каб зрабіць іх больш сціплымі.

**СУКЕНКА-СВІТАР**

Можна дадаць яркі пояс і каралі — і гэта ўжо вячэрні варыянт.

**ЖАКЕТ У СТЫЛІ МІЛІТАРЫ**

Стыль мілітары трывала замацаваўся ў топе модных кірункаў сезона. Такі жакет будзе стыльна выглядаць і са штанамі (джынсамі), і з сукенкамі (спадніцамі).

**КАШАМІР**

Кашамір мае мяккі, шыкоўны выгляд, з кашаміру могуць быць як світары, кардыганы, так і шалікі ці сукенкі.

**ЗАМШАВАЯ СУМКА**

Замшавая сумка дадасць цеплыні халоднаму восеньскаму надвор'ю і настрою.

## Алё!

### З Маладзечнам гаворым па-новаму

**У Маладзечне і Маладзечанскім раёне ў сувязі з павелічэннем абаненцкай базы тэлефоннай сеткі мяняецца код і ўводзіцца шасцізначная нумарацыя. Пераход на новую нумарацыю, як паведамляе РУП «Белтэлекам», пачне дзейнічаць з 00.00 гадзін 14 лістапада.**

З гэтага часу тэлефанаваць трэба будзе наступным чынам: набіраць код горада 8017 6 замест старога 8017 73, а да ранейшых пяцізначных нумароў тэлефонаў дадаваць першую лічбу 7. У межах Беларусі нумары будуць выглядаць як 8017 6 7XXXXX, міжнародны фармат набору +375 17 6 7XXXXX.

Пры памылковым наборы аўтаінфарматар паведаміць правільны парадак нумарацыі. Таксама пра змяненне парадку набору нумароў абанентаў праінфармуюць у даведачнай службе 153 (нумар бясплатны).

## Парламенцкі дзённік

# СЭКС ПА ТЭЛЕФОНЕ — ГЭТА ВАМ НЕ ПСІХАЛАГІЧНАЯ ДАПАМОГА

Паводле дзейнага ў Беларусі заканадаўства, аказанне псіхалагічнай дапамогі адносіцца да сацыяльных паслуг. Аднак дагэтуль у краіне не было комплекснага нарматыўнага акта, які б прапісваў, што канкрэтна адносіцца да псіхалагічнай дапамогі, рэгламентаваў яе аказанне, вызначаў адзіныя патрабаванні да такой дзейнасці і кантролю за ёй. У той час як у многіх краінах аказанне псіхалагічнай дапамогі падпарадкоўваецца літары закона (у Аўстрыі, Германіі, Польшчы, ЗША і іншых). У ЗША, напрыклад, псіхалагічныя паслугі з'яўляюцца складанай часткай медыцынскай дапамогі і ліцэнзаваным відам медыцынскай дзейнасці. А ў Расіі цяпер распрацоўваецца праект закона аб псіхалагічнай дапамозе насельніцтву. Прабел у айчынным заканадаўстве можа быць прычынай некваліфікаванай псіхалагічнай дапамогі, якая наносіць шкоду здароўю грамадзян. Да таго ж, «гэта значна ўскладніла працу спецыялістаў, паколькі ў кожнай галіне аказанне псіхалагічнай дапамогі трактавалася па-свойму», — падкрэсліў на пашыраным пасяджэнні профільнай камісіі ў ніжняй палаце парламента **першы намеснік міністра аховы здароўя Роберт ЧАСНОЙЦЬ.**

— Нярэдкія выпадкі, калі пад відам псіхалагічнай дапамогі робяцца паслугі сэксуальнага характару, у прыватнасці, распаўсюджанне атрымалі паслугі пры дапамозе тэлефоннай сувязі, — адзначыў першы намеснік міністра.

Ён таксама нагадаў дэпутатам, што дагэтуль заканадаўствам не былі ўрэгуляваныя пытанні, звязаныя з народнай медыцынай, так званым лекарствам. Р. Часнойць падсумаваў, што для ўпарадкавання дзейнасці дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый па аказанні псіхалагічнай дапамогі, у тым ліку з выкарыстаннем сродкаў электрасувязі (тэлефон даверу), неабходны заканадаўчы акт, у якім будуць дакладна названыя адзіныя патрабаванні да спецыялістаў і арганізацый, якія робяць такія паслугі, механізм кантролю за аказаннем такой дапамогі і нормы адказнасці.

Адпаведны законапраект быў абмеркаваны падчас пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі. Паводле яго ліцэнзаванне ўстаноў, што прапануюць паслугі па псіхалагічнай дапамозе, — у кампетэнцыі Міністэрства аховы здароўя... Адказны за гэты законапраект **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Алег САКАДЫНЕЦ** (між іншым, прафесійны псіхіятр) падкрэсліў, што дакумент вельмі зацікавіў тэарэтыкаў і практыкаў сістэмы аховы здароўя і адукацыі. У сваю чаргу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Святлана ШЫЛАВА** (дарэчы, таксама медык па спецыяльнасці) звярнула ўвагу ўдзельнікаў абмеркавання на тое, што ў законапраекце не адлюстроўваецца медыцынская псіхалогія. А сёння як ніколі патрэбныя медыцынскія псіхолагі ў арганізацыях аховы здароўя — і ў анкалогіі, і ў радзільных дамах...

**Ала МАЧАЛАВА.**

### ГІНУЦЬ ПАД КОЛАМІ

На тэрыторыі ПМК-10 у Жабінцы пад коламі а/м «Камаз» загінуў вадзіцель. Аўтамабіль не быў пастаўлены на тормаз і пачаў рухацца. І ў сховішчы гародніны каля вёскі Волька Ляхавіцкага раёна здарылася трагедыя. Там вадзіцель на а/м «ЗІЛ-130» даў задні ход і наехаў на рабочага, жыхара вёскі Плошніца, які сканаў на месцы здарэння.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### АДНА ЕХАЛА, ДРУГАЯ ЛЯЖАЛА...

Трагедыя здарылася каля вёскі Відамля Камянецкага раёна. 23-гадовая жыхарка вёскі Чарнаўчыцы на машыне «Аўдзі-100» вярталася дадому па дарозе Высокае-Слонім. А жыхарка вёскі Шалічы ляжала на праезжай частцы без усялякіх святлоадбівальных элементаў. Адбывалася гэта ў 23.40, і ў цемры вадзіцель не заўважыла чалавека.

**Яна СВЕТАВА.**

### АДРАЗУ ТРОЕ ЗАГІНУЛЫХ

Гаспадар дома і двое ягоных гасцей загінулі пры пажары ў прыватным доме ў Віцебску. Прычына — неасцярожнасць пры курэнні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Уважаемые участники рекламной игры «Осень с Жардин теплее»!

Обращаем ваше внимание, что в пункт 9 Правил рекламной игры **«Осень с Жардин теплее»**, сроки проведения с 24 сентября по 10 октября 2009 года, внесено изменение.

**Пункт 9 Правил рекламной игры читать в следующей редакции: «9. Механизм проведения Игры:**

Для участия в Игре необходимо в период с 24 сентября по 10 октября 2009 года:

приобрести кофе торговой марки **«Жардин»** на сумму более **18 000** белорусских рублей в торговых точках г. Минска или на сумму более **17 000** белорусских рублей в торговых точках других городов согласно графику, приведенному в п. 10, и первому обратиться к промоутеру с товарным (кассовым) чеком, подтверждающим факт приобретения продукции Жардин. В обмен на товарный (кассовый) чек, свидетельствующий о приобретении продукции Жардин на определенную сумму, промоутер, работающий в торговой точке, предлагает Участнику выбрать карточку. Участник рекламной игры в присутствии промоутера стирает защитный слой с выбранной им карточки и получает приз, обозначенный под защитным слоем карточки».

**Телефон «горячей линии» (8-029-322-42-52)**

Свидетельство о регистрации правил рекламной игры №1539 выдано Министерством торговли РБ 14.09.2009г.

**ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

**2 ноября 2009 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий | Срок аренды, (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Объездная | 340100000005005439 | 0,156 | здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей (с мойкой). См. примечание | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона электрокабеля 0,0253 га | 50 | 2 073 129 | 23 275 590 | 2 327 000 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 2 ноября 2009 г.** в **15.00** в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, при наличии не менее двух участников на лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

4.1 Представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь представляют доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка в белорусских рублях или иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням с 9.00 до 17.00 по 27 октября 2009 г. включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.50 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Примечания:** плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт: www. gorod.gomel.by**

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

2 КАСТРЫЧНІКА 2009 г. ПЯТНІЦА № 37 (15591)

# ХТО НАКОРМІЦЬ СТУДЭНТА?

**ЯКАЯ яна — студэнцкая кухня? Антыкрызісны бутэрброд з замарожанай сасіскай, садранай на тарцы, пельмені, смажаныя з бульбай, кампот з вішнёвага варэння — усё, што можа дазволіць сабе звычайны студэнт? Гісторыя гэтай кухні пакуль не ведае, ці будуць праз некалькі стагоддзяў яе стравы далікатэсамі. Страўнік сучасных студэнтаў патрабуе зусім не тлумачэнняў, а канкрэтнай ежы. Дзякуючы эвалюцыі, на свет з'явіліся студэнцкія сталовыя, дзе і харчуюцца навучэнцы ВНУ. Каб не заставацца ў баку ад гісторыі, давайце пакаштуем іх стравы і падзелімся ўражаннямі.**



**СТАЛОВАЯ № 1.**
**Месца:** БДУ (галоўны корпус).
**Нацэначная катэгорыя:** 3.
**Час працы:** з 10.00 да 17.00.

Каб знайсці сталовую Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, трэба было арыентавацца на пах. Водары сустрэлі ўжо каля ўваходу ў корпус. Я прыйшла ў сталовую акурат у гадзіну дня, таму ахвотных паабедаць было хоць адбаўляй. Студэнты доўгай чаргой, якая завівалася і прападала далёка за межамі сталовай, выстраіліся з падносамі ў руках. Пахі толькі раздражнялі апетыт і не давалі супакоіцца страўніку. Студэнты ўвесь час пазіралі на гадзіннік, таму што ахвотных падсілкавацца было намнога больш, чым часу, выдзеленнага на абед.

— Часта заходзіце ў сталовую? — з бяскрыўдным пытаннем падсаджваюся за стол да Дашы Падабец, студэнткі другога курса механіка-матэматычнага факультэта.

— У час вялікага перапынку не паспяваю, таму што чарга вялікая. Калі «фортка» ў раскладзе ёсць, тады і прыходжу. А сталовая мне падабаецца. Дарагавата, аднак, калі хочацца падсілкавацца, цана адыходзіць на другі план, — тлумачыць Даша.

Адзін абед у сярэднім абыходзіцца ў 4-5 тысяч беларускіх рублёў. На гэтыя грошы асабліва не разгуляешся, а вось паставіць сабе на паднос малочны суп з проса (460 бел. руб.), рысавую кашу (230 бел. руб.), катлету «Папараць-кветка» (2280 бел. руб.) і кампот з курагі (350 бел. руб.) — магчыма. Зразумела, мамінымі блінамі, прыгатаванымі з душой і смятанай, тут і не пахне, аднак пахне іншымі стравамі. Напрыклад, парадаваць свой страўнік студэнт можа салатай «Мінірэль» за 1500 руб., заліўной гарбушай за 1560 руб. або салатай з птушкі з вяндлінай за 1820 руб. Тады трэба адмовіцца ад супчыку і гарбаты з булачкай, таму што бюджэт студэнта такога асартыменту, на жаль, не вытрымае. Увогуле, для таго, каб харчавацца ў сталовай хоць адзін раз на дзень, па студэнцкіх мерках, фінансавыя магчымасці трэба мець неабмежаваныя. Пры такім раскладзе сярэдняя стыпендыя (140 000 руб) амаль цалкам павінна расходавацца на абеды. Аднак не хлебам адзіным жыве чалавек, тым больш студэнт.

Седзячы ў сталовай, узгадала эпізод з кінафільма «Каралева бензакалонкі», калі ў галоўнай гераіні Людмілы Добрывечар выклікалі абурэнне штучныя кветкі ў кавярні. Такія ж кветкі можна ўбачыць і тут. Студэнты ўспамінаюць камедыю і пасмейваюцца, а кветкі не пахнуць і прыгажосці не надаюць. Увогуле, сталовая мае не вельмі прывабны знешні выгляд. Само памяшканне невялікае па памерах, таму і свабодных столікаў часта не знайсці. Тым больш, яна абслугоўвае не толькі студэнтаў, якія вучацца ў галоўным корпусе БДУ, а і навучэнцаў юрыдычнага, хімічнага і геаграфічнага факультэтаў. Што цікава, усе апытаныя мной студэнты адзначылі, што абслуговы персанал заўсёды ветлівы і працуе хутка. Можа, таму, нягледзячы на ўсе нязручнасці, студэнты БДУ сваю сталовую ні на якую іншую не прамяняюць.

**СТАЛОВАЯ № 2.**
**Месца:** БДПУ імя Максіма Танка.
**Нацэначная катэгорыя:** 3.
**Час працы:** 9.30 — 17.00.

У сталовай у БДПУ імя Максіма Танка ў 14 гадзін было зусім нешматлюдна. Цішыня і спакой панавалі ў памяшканні. Маўчаў і тэлевізар, які ўзвышаўся на тумбе. Я, здзіўленая такім штылем, пачала спакойна вывучаць меню. Навучэнец педагагічнага ўніверсітэта можа пакаштаваць даволі незвычайныя стравы. Напрыклад, у меню студэнцкай сталовай разам са звычайнай сасіскай за 2220 руб. і гуляшом за 2200 знаходзіцца сумесь з гародніны па-мексіканску (1800 руб.) і зразы з грыбамі (2450 руб.). Такая кулінарная навізна попытам у студэнтаў не карыстаецца. Па-першае, не кожны зможа падсілкавацца адной гароднінай на ўвесь працоўны дзень, па-другое, цэны на такія стравы высокія. Таму студэнт выбірае тое, што прывык бачыць на сваім стале за адпаведны кошт.

Дарэчы, ізноў жа наракалі на высокую цану. Папіць кампоціку з клубніцаў можна за 700 рублёў, з'есці суп з фрыкадэлькамі і фасоляй — за 1300. Для такога харчавання на працягу месяца ніякай стыпендыі не хопіць. Самаабслугоўванне ў поўным сэнсе. А тэлевізар увогуле ўключаюць толькі па вялікіх святах. На жаль, я на такое свята не трапіла.

— Універсітэт праводзіць тэндар на пастаўку прадуктаў у нашу сталовую, таму цэны фарміруюцца згодна з закупачнымі. Мы робім нацэнку ў 40 працэнтаў, паколькі маем трэцюю нацэначную катэгорыю. А што датычыць цэнаў, то лепш паглядзіце, якія дарагія цыгарэты яны кураць і колькі піва п'юць, — трымае абарону дырэктар сталовай Тамара Ражкова.

Разам з Тамарай Іванаўнай мы склалі прыкладнае меню для студэнта. Яно выглядала так: салат «Беласнежка» (капуста, агуркі, памідоры, цыбуля) — 640 руб., суп малочны — 330, каша рысавая — 310 руб., гуляш з ялавічыны — 2200, сок таматны — 800 руб. Такі антыкрызісны варыянт бюджэт студэнта асабліва не патурбуе, а голад — нейтралізуе.

**СТАЛОВАЯ № 3.**
**Месца:** Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.
**Нацэначная катэгорыя:** 3.
**Час працы:** 11.00 — 17.00.

Смачна, хутка, ветліва — так ахарактарызавалі студэнты медыцынскага ўніверсітэта сваю сталовую. Шчыра кажучы, мяне гэта прыемна здзівіла, і я вырашыла на сабе праверыць праўдзівасць выказвання. Тым больш, у разгар абедзеннага перапынку вялікай чаргі ў сталовай не назіралася, а есці ўсё ж хацелася.

Я бяру паднос і накіроўваюся да меню. Яно не складанае, літаральна за хвіліну выбіраю свой абед, які складаецца з баршчу (770 руб.), рыбы ў кляры (2330) і гарбаты (320). Увогуле, студэнт можа без цяжкасцяў выбраць страву па душы, тым больш, яна не належыць да кулінарных шэдэўраў. Тут усё проста: свініна за 3000 руб., шніцэль — 1300, макарона — 340. На касе мне сказалі «дзякуй» і ўсміхнуліся. Гэта падкупляе.

Есці, седзячы перад тэлевізарам, шкодна, пра гэта ведаюць усе ўрачы. Аднак самі ж гэта правіла з поспехам парушаюць. Студэнты падсілкоўваюцца, гледзячы навіны і фільмы па тэлевізары, які працуе ў сталовай. Будучым медыкам такі прадмет інтэр'ера падабаецца, таму што дома часу на ўсё не хапае, а тут, калі пашанцуе, можна і любімы серыял пагледзець.

Увогуле, сталовая медыцынскага ўніверсітэта ідэальная для студэнтаў. Яна прасторная. Свабоднае месца знойдзецца заўсёды. Чаргі амаль ніколі не бывае, таму што ў час пік працуюць дзве касы. Адным словам, дзевяць балаў з дзесяці. Так ацанілі студэнты сваю сталовую. З імі згодна і я.

### Ёсць праблема

Студэнцкія сталовыя на фоне іншых месцаў грамадскага харчавання сталіцы выглядаюць таннымі і эканамічнымі. Непасрэдна для навучэнцаў ВНУ карціна зусім іншая. Студэнту не па кішэні кожны дзень харчавацца ў сталовай. Іншы раз ён знаходзіць перад цяжкім выбарам — салата ці паездка на метро. Безумоўна, у час фінансавага крызісу гаварыць пра зніжэнне цэнаў здаецца неверагодным, аднак выйсце можна знайсці. Паколькі студэнты — гэта сацыяльна неабароненая частка насельніцтва, з абмежаванымі даходамі, то і цэны для іх павінны быць адпаведнымі. Закупка прадуктаў харчавання ў тыя ж сталовыя павінна праводзіцца са зніжкамі або на льготных умовах. Усе эканамічныя аперацыі можна разлічыць, толькі трэба ўзяцца за справу.

**Вольга КОРШУН.**

# Беларуская творчая моладзь на музычным алімпе

**На гэтым тыдні ў Растове-на-Доне завяршыўся IV фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». Сёлета ў фэсце прыняла ўдзел беларуская нацыянальная моладзевая дэлегацыя, у якую ўвайшлі амаль 100 юнакоў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў краіны. Усяго форум сабраў больш за 15 тысяч чалавек. Сярод іх — дэпутаты Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі, прадстаўнікі моладзевых аб'яднанняў, студэнты і юныя таленты абедзвюх краін. Праграма моладзевага фэсту была насычана мерапрыемствамі. У прыватнасці, прайшлі канцэрты, сустрэчы з Алімпійскімі чэмпіёнамі, дзеячамі спорту, культуры, моладзевай палітыкі дзвюх краін, выстава-прэзентацыя грамадскіх моладзевых аб'яднанняў Беларусі і Расіі і многае іншае. Вынікі форуму падводзіць першы сакратар ЦК БРСМ Юрый КРЫВАДУБСКІ.**

— Цэнтральнай падзеяй фэсту стаў IV Міжнародны конкурс выканаўцаў моладзевай песні. Прыемна адзначыць, што беларуская творчая моладзь выступіла годна і ўзначаліла музычны Алімп. На нашым рахунку 6 прызоў. 1 месца ў Міжнародным конкурсе выканаўцаў моладзевай



песні заняла Вераніка Чарняўская (г. Крупкі), 2 месца — Сяргей Полазаў (г. Бабруйск), 3 месца — Дзмітрый Мулярчык (г. Гродна). Спецыяльныя прызы былі прысуджаны журы маладой спявачцы Катрын з г. Мінска (у намінацыі «Лепшая аўтарская песня»), спявачцы Святлане Мосінай з г. Гродна (за лепшае акцёрскае майстэрства). Гомельскай групе «Miss Silence» дастаўся заслужаны «Прыз глядацкіх сімпатый». Аўтарскія статуэткі для ўсіх канкурсантаў-удзельнікаў былі выраблены на шклозаводзе «Нёман». Судзіла канкурсантаў кампетэнтнае журы. У яго склад уваходзілі: спявачка Варвара (старшыня журы), Ірына Дарафеева, Аляксей Катляроў, Віталь Гардзей, Яна Курыленка, спявачка Гюнеш і музычная студыя «Чараўнікі двара». Асаблівасцю фэсту гэтага года стала выступленне яго ўдзельнікаў не толькі ў Растове-на-Доне, але і на фестывальных пляцоўках у Батайску, Каменск-Шахцінску, а таксама ў гарадскім Палацы культуры ў Азове. Адным з яркіх момантаў форуму стаў канцэрт з удзелам пераможцаў дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне» розных гадоў з Беларусі і Расіі.

Таксама ў рамках фэсту прайшлі пасяджэнні пастаянных камісій Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі. На пасяджэнні камісіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях моладзевыя лідары прапанавалі свае ініцыятывы па ўмацаванні стасункаў паміж моладдзю Беларусі і Расіі ў розных сферах дзейнасці. У прыватнасці, размова ішла аб сумесным удзеле моладзевых арганізацый дзвюх краін у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных 65-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, аб стварэнні і арганізацыі работы зводнага беларуска-расійскага студэнцкага атрада для работы на алімпійскіх аб'ектах, аб рабоце беларускіх моладзевых валанцёрскіх атрадаў па ўзвядзенні алімпійскіх аб'ектаў у Сочы і спартыўных збудаванняў да Чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, які адбудзецца ў Беларусі. Дэпутаты падтрымалі прапановы БРСМ. У самы бліжэйшы час саюз моладзі і вядучыя моладзевыя арганізацыі Расіі павінны падаць у Парламенцкі Сход Беларусі і Расіі дапрацаваныя праекты.

Каб даведацца адно пра аднаго, неабходна сустракацца ў нефармальнай, сяброўскай абстаноўцы. Пераймаць цікавыя напрацоўкі, ідэі, ініцыятывы, якія дазваляюць узбагаціць моладзевы рух Беларусі і Расіі.

***— Якімі напрацоўкамі можа пахваліцца БРСМ перад моладзевымі арганізацыямі Расіі?***

— На фестывалі падчас пасяджэння пастаянных камісій Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі наш актыў прапанаваў 3 тэматычных пляцоўкі: па патрыятычным выхаванні моладзі, па прапагандзе здаровага ладу жыцця, а таксама прайшла прэзентацыя моладзевага валанцёрскага руху БРСМ «Добрае сэрца». Падчас яе была праведзена дабрачынная акцыя-канцэрт маладых талентаў Беларусі і Расіі. І расіяне адзначалі, што нашы падыходы, напрацоўкі іх вельмі ўразілі. У нас усё гэта вядзецца на сістэмнай аснове. У Расіі ёсць некалькі дастаткова буйных моладзевых арганізацый, якія прысутнічаюць ва ўсіх рэгіёнах. Гэта «Моладзевая гвардыя Адзінай Расіі», «Расійскі саюз моладзі». Яны таксама былі ўдзельнікамі фестывалю.

***— Што карыснае, новае мы можам пераняць ад расійскай моладзі?***

— Нам неабходна актывізаваць праектную дзейнасць. У Расіі зроблены акцэнт на праекты, якія падтрымліваюцца з федэральнага, мясцовых бюджэтаў, і гэта ўсё ідзе на конкурснай аснове. Гэта значыць, тая арганізацыя, якая прапануе лепшы праект, зарэкамендуе сябе, атрымае падтрымку з бюджэту.

***— А які горад прыме наступны фэст?***

— Гэта пытанне, натуральна, абмяркоўвалася, але канчаткова пакуль яшчэ не вырашана. Разглядалася магчымасць таго, што пяты фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» прыме Смаленск. Але пакуль гэта на стадыі абмеркавання. Магу сказаць адназначна, што фестываль будзе, а месца правядзення не адыгрывае істотнай ролі.

**Святлана СУХАРКО.**

# ШАКАЛАДНЫЯ БАІ — айчыннае рэаліці ў рэжыме он-лайн

## «Баі амазонак»: як гэта было

**«Даўным-даўно ў часы багоў і тытанаў, герояў і пачвар існавала асобная дзяржава. Яе грамадзяне былі ваяўнічымі і адважнымі, хоць і не было сярод іх мужчын. Жанчыны ўступалі ў сувязь з суседнімі народамі толькі дзеля працягу роду. Хлопчыкаў, якія нараджаліся, адсылалі да бацькі, а дочкі выраслі бясстрашнымі ваяўніцамі. Імя ім — амазонкі! Легенды часам ажываюць. Часы амазонак вяртаюцца...».**

Чарговая легенда ажыла ў Мінску напрыканцы верасня. Калі пачуў яе, у мяне адразу ўзніклі асацыяцыі з жанчынамі, набедранымі павязкамі і першабытна-абшчынным ладам. Як высветліцца пазней, памыляўся я не нашмат.

— Ідэя зарадзілася ў нашым рэкламным агенцтве «Медыялот», — расказала нам **арганізатар шоу Вольга МУДРАЯ**. — З пачаткам крызісу стала крыху цяжкавата. І мы думалі, у якім яшчэ напрамку можна пачаць працаваць. Адной з ідэй стала шакаладнае шоу для беларускай публікі. Я хачу, каб наша публіка была больш адкрытай і больш актыўнай: каб не баялася новых кірункаў, якія перад ёй адкрываюцца. Публіцы больш сталай гэта шоу павінна спадабацца ўдвая: такога яна ніколі не бачыла. Маладзейшая ж нешта падобнае можа ўзгадаць ва Украіне (Крым). Для беларускага шоу мы правялі адмысловы кастынг, дзе асноўную ўвагу звярталі на дзяўчат, моцных духам. І так атрымалася, што выбраныя намі дзяўчаты — спартсменкі ад 20 да 27 гадоў.

Шоу арганізоўвалася ў клубе «Roxy Club», які разлічаны на 300 гледачоў. І прадаючы білеты на шоу (ад 25 да 60 тысяч беларускіх рублёў) арганізатары, відаць, разлічвалі, што зала будзе запоўнена цалкам. Але беларускі глядач паказаў сябе кансерватарам, таму на шакаладнае шоу прыйшлі толькі самыя цікаўныя. Добрую частку складалі журналісты.

— Многія прыходзяць па славу, — дадае Вольга Мудрая. — Калі вас ведаюць толькі ў адным Мінску, хочацца, каб ведалі і ва ўсёй Беларусі. Таму дзяўчаты ўлічваюць і магчымасць заявіць пра сябе. Пераможцу баёў у якасці прыза чакае славуты пояс амазонкі плюс прызы ад спонсараў.

### Жульена і відовішчаў!

Глядзець, як дубасяць адна адну ў шакаладзе дзяўчаты, можна было двума спосабамі: стоячы ля барнай стойкі і седзячы за столікам. За магчымасць сядзець нам са знаёмым давялося раскашэліцца на 90 тысяч. Дакладней, не нам, а мне. Мой знаёмы быў італьянцам і запрошаны быў па маёй ініцыятыве, таму, натуральна, пра выдаткі з яго боку я нават не ўзгадваў.

